проза

Югася Каляда



...я – найлепшая, найпрыгажэйшая, найразумнейшая: жывы геній сучаснасьці...

# Добрай раніцы планета

Дваццаць восьмага чэрвеня, ноч з пятніцы на суботу.

Не падабаецца мне сёлетняе лета.

Мабыць, гэта дзіцячыя прымхі: лічыць, што лета – заўжды: а) адпачынак; б) сьпёка. Ні таго, ні другога. Канец чэрвеня – а я ўсё яшчэ апранаюся як капуста: майка, швэдар, куртка... Яшчэ й хустка на шыю. І парасон. Нашто было цягнуць у Менск поўную торбу сукенак? Усяго толькі пару разоў выйшла з голымі нагамі, і тое сьсінела, пакуль чакала трамваю. Божа, я ўжо маўчу пра адпачынак – які адпачынак падчас сесіі? Адныя нервы й барталамееўскія ночы – натуральна, усё вучыцца ў ноч перад іспытам. Так і скончыўся чэрвень, а ў ліпені мне зноў на працу... Суцэльны жах.

Але да ад’езду ў Гомель ажно тры дні – тры абсалютна вольныя дні. Экзамены я здала, застаўся

толькі залік з францускае мовы ў нядзелю, але гэта лухта – так, прыйсьці адзначыцца з залікоўкай. Тры вольныя дні. І ночы, што важна.

Я запаліла таршэр, ляжу ды чытаю. Ірка мая ўцякла ў ноч на таксоўцы, таму я парушаю ўсе ўсталяваныя намі законы: палю ў ложку.

Таршэр блакітны, і дым блакітны, і мае пальцы таксама блакітныя; і ананімная радыёхваля пачынаючы з другое гадзіны ночы выпускае ў эфір нешта цалкам прыймальнае. Божа, я амаль шчасьлівая! Я нагатавала кавы, загрувасьціла крэсла пры ложку печывам, яблыкамі, стосікам нечытаных кніжак, ляжу, палю ды чытаю пад блакітным таршэрам.

Не, гэтае лета ўсё ж пачынае мне падабацца. Пагатоў зараз я зраблю яшчэ адну рэч, з чаго атрымаю асалоды – нямерана! Я вазьму мой новы блакітны тэлефончык і набяру адзін нумар. Палова на трэцюю – падкрэсьліваю.

Загадзя дакладна ведаючы, што нікога няма дома, я ўсё адно хвалююся пры першых двух гудках. Але на наступных трох... чатырох... дзевяці... асалода мая набывае глыбіню. Яе нават цяжка з нечым параўнаць: як дно студні? Ці як калюжына, у якую нага раптоўна правальваецца па калена? Я ня проста чую – я бачу, як стары карычневы тэлефон пранізьліва зьвініць у калідоры цёмнае кватэры, палохаючы суседзяў. Сродак трапіць у чужое жытло, калі няма гаспадара. Я выключаю тэлефон, кладу яго на крэсла, і ён яшчэ роўна дзесяць секундаў гарыць халодным блакітным сьвятлом.

Што я яшчэ люблю рабіць такога кшталту?

Мінаючы прывакзальныя мясьціны, зрабіць невялікае кола ў бок прыпынку маршрутак, адзначыць наяўнасьць патрэбнага мікрааўтобусу, усхваляваццa, супакоіцца ды крочыць далей. Магла б сесьці ды паехаць. Але ня села, не паехала. Магла б зьявіцца на вочы – не зьявілася. Не захацела.

Дзеля чаго я гэта занатоўваю? Зараз патлумачу.

“... Я прачынаюся ў цёмным, халодным, пустым пакоі пад грукат будніка. Сонейка маё!.. Раніца без цябе – гэта ня ранак, а працяг жахлівага сну. Пасьля я падымаюся, запальваю сьвятло, мыю твар, стаўлю імбрык, палю... Я іду на працу, жартую, сьмяюся – у мяне няма ніякае дэпрэсіі, я задаволеная жыцьцём, я адчуваю сябе шчасьліваю. Я не сумую па табе, я нат ня згадваю цябе – ні ўдзень, ні ўвечары, ні ўначы. Але ранак...”

Я напісала гэты абзац узімку, і склала я яго, прачынаючыся менавіта ў гэтым ложку. Я мелася стварыць нешта шчымліва-пранізьлівае пра каханьне без адказу, але выціснула з сябе ўсяго толькі старонкі тры, з якіх найлепшым быў адно першы абзац. Муза ад мяне па-здрадніцку ўцякла, абураная маёй хлусьлівасьцю. Ха, “раніца без цябе – працяг жахлівага сну”! Для мяне ўзімку любая раніца (то значыць усё, што ранейшае за дзесяць гадзінаў) – працяг жахлівага сну, а што тычыцца “без цябе” – дык агулам нагадвае практыкаваньне з падручніка логікі. Я ўсё сваё жыцьцё, з рэдкімі выняткамі, прачынаюся “без цябе”, кім бы гэты “ты” ні быў.

Але ў гэтым выпадку “ты” мае акрэсьленыя рысы й нават цалкам рэальны прататып. Крыніца майго крывабокага натхненьня цяпер спакойна сьпіць у сваіх бацькоў у горадзе Вілейка.

Ах, Сева, Севачка! Спадар Усевалад. Я так доўга спрабавала спагнаць з цябе даніну ў форме натхненьня! Але, на жаль, заўжды безвынікова. Мабыць, мала заплаціла. Чым плоцяць за натхненьне? Пакутамі, дэпрэсіўна-маніякальнымі сіндромамі, агульнаю млявасьцю й абыякавасьцю да жыцьця з думкамі пра самагубства. А мне з твае нагоды ніводнага разу не ўдалося нават паплакаць. Я спрабавала – процьму разоў! – забіць сябе жахлівым усьведамленьнем таго, што ты мяне не кахаеш. Ха, якая трагедыя: нібы я цябе кахаю!

Але ўсё: графаманскі шал апанаваў мяне. Я ўсё ж закончу гэты опус і можа нават ахвярую яго табе. А мо', і не. Яшчэ падумаю.

А, ледзь не забылася! Даруй, Сева, пасунься. Я ж прагну зганіць на ўвесь сьвет Іну Іванаўну, якая паставіла мне "чатыры" на выпыце з беларускае мовы. Салют, Іна Іванаўна! Віншую Вас з трапляньнем у скарбонку сусьветнае літаратуры!

Ну вось, зганіла. Вяртаемся да Севы. Не, я ўжо перадумала – ня буду ахвяроўваць яму свайго твору. Абыдзецца як-небудзь. До' з таго, што ён ужо трапіў на першую старонку.

Ужо лепш пісаць пра лёс свайго пакаленьня, калі злавіла графаманскую хвалю. Кожны графаман, з амбіцыямі ды прэтэнзіямі, мроіць стварыць нешта маштабнае пра "лёс пакаленьня". Так і сьніць уначы сваё імя ў школьных падручніках: "Такі а такі ў сваіх творах з уласьціваю яму геніяльнасьцю раскрыў... паказаў... прымусіў нас зразумець... Ягоны геніяльны твор – гэта энцыклапедыя побытаў і звычак..."

Але маё пакаленьне мяне таксама мала натхняе.

Па-першае: а чаму яно маё? Яшчэ, дарэчы, трэба разабрацца, хто каго не натхняе. Хутчэй, гэта я не натхняю сваё пакаленьне. "На труд и на подвиги"...

Па-другое... І тэма гэтая ня новая, і наогул непрыгожа станавіцца ў позу ды звальваць на аднагодкаў усе хібы, збольшага ўласныя: інфантылізм, інертнасьць... Адсутнасьць "высокіх ідэалаў" і няздольнасьць прадбачыць "сьветлую будучыню". Непрыгожа караскацца на п'едэстал і, склаўшы рукі па-напалеонаўску, пагардліва пазіраць долу. "Што за пытаньне – пра што фільм? А пра што ўвогуле мастацтва? Што вы вачыма лупаеце? Ну так, я ведаю, "Siemens" круцейшы за "Nokia" – вось тэмы вашых гутарак. Ну размаўляйце, я пайшла, бывайце".

Жывы геній сучаснасьці, пакрыўджаны неразуменьнем з усіх бакоў... Непрыгожа. Сябе хаця б зразумела.

Што й спрабую зрабіць. Пакуль ня надта плённа. Адсутнасьць сюжэту – вось хвароба сучаснае літаратуры. Нейкіх сто гадоў таму я не дазволіла б сабе патанаць у гэтай плыні сьвядамасьці, з якое марна спрабую вылавіць нератам сваіх пачуцьцяў сюжэт.

Таксама марна я спрабую знайсьці гэты сюжэт ува ўласным жыцьці. Больш дакладна – я спрабую зразумець, ці ёсьць Лёс, які ўпэўнена, не зважаючы на нашыя енкі ды скаргі, вядзе кожнага да пэўнае Мэты?

Пытаньне. Адсутнасьць ці наяўнасьць Лёсу – даўняя й невычэрпная тэма нашых гутарак з Ірай. Мы нават склалі адзін сцэнар да фільму й ужо мелі намер адаслаць яго ў Галівуд, але рукі нашыя не дайшлі хаця б да яго натаваньня, ня кажучы пра пераклад на ангельскую мову.

Гэта была гісторыя пра анёлаў, што вымагала ну проста фантастычных дэкарацыяў, да таго ж здымаць трэ' было і ў Гомлі, і ў Парыжы. Ну й на нябёсах. Вось сцэнар, чытайце! Паспрабуйце сабе ўявіць галівудскі фільм, жудасна дарагі й цікавы.

*"Раніца. Анёл прачынаецца, каб ісьці на працу. Трэба паказаць, як ён пацягваецца перад люстэркам, як выпроствае свае вялікія крылы. Усё гэта адбываецца на аблоках, уся ягоная кватэра зробленая з аблокаў, белых і рухомых. І вось, калі ён чысьціць зубы, звоніць ягоны тэлефон.*

*– Ну... Прачнуўся ўжо, дзякуй... Нармальна... Ага... Ну... Так... Добра было б... Але не, ты што, сёньня не магу!.. Не, ніяк не магу, толькі заўтра!.. Не, ты што – у мяне ж сёньня Першая й Апошняя Сустрэча!.. Натуральна, хвалююся!.. Ага, перазваню... Ну давай, бывай!*

*Вось ён нарэшце выходзіць з дому й рушыць на сваю працу. Едзе ў грамадскім транспарце, там анёлаў плойма – "гадзіна пік", усе штурхаюцца, нярвуюцца: "Не падабаецца ехаць – дык выходзь і сам ляці!" Наш анёл таксама нярвуецца, бо сёньня – заключны дзень вялікага перыяду ягонае працы – Першая й Апошняя Сустрэча.*

*Наш анёл працуе анёлам-абаронцам у Сусьветным Цэнтры Чалавечага Лёсу. Анёл-абаронца пільнуе й кіруе аднаго чалавека ўсё ягонае жыцьцё, пасьля ягонае сьмерці выходзіць у адпачынак, а потым зноў атрымлівае новага чалавека.*

*Пасьля таго, як душа памерлага адбыла пэўны тэрмін у разьмеркавальніку (народны назоў – чысьцец), анёл сустракае яго на нябёсах, выслухоўвае скаргі, абмяркоўвае шчасьлівыя дні, улічвае хібы ў сваёй працы ды разьвітваецца з чалавекам. Чалавек перанараджаецца або ператвараецца ў нешта, анёл атрымлівае новага выхаванца. Вось гэтая сустрэча свайго памерлага з разьмеркавальніка й называецца Першай і Апошняй Сустрэчай.*

*Калі наш анёл нарэшце, з вялікім спазьненьнем, пад'язджае да Вялікае Брамы разьмеркавальніку, ён разумее, што дарма сьпяшаўся – душаў яшчэ нават не зьбіраюцца выпускаць. Ля Брамы сабраўся вялікі натоўп абураных анёлаў. Ніякай інфармацыі няма. Паводле пагалоскі, што ходзіць у натоўпе, Сустрэча адцягваецца гадзіны на чатыры: нібы выявіліся нейкія няўлічаныя грахі, з якімі трэба разабрацца. Апостал Пётра, вартаўнік, нярвуецца, злуецца й зрэдчас лаецца з абаронцамі, стрымліваючы націск натоўпу.*

*Неўзабаве стомленыя анёлы паселі хто дзе. Наш апынуўся побач з нейкім анёлам, якога ведаў адно ў твар – спатыкаліся ў Цэнтры. Яны пачынаюць звычайную гутарку, і раптам высьвятляецца, што іхныя выхаванцы былі ў часе кагадзе завершанага жыцьця непарыўна зьвязаныя міжсобку. Яны загінулі пры лабавым сутыкненьні іхніх аўтамабіляў на хуткай магістралі ў ваколіцах Рыму. Гэты надзвычайны факт служыць падставаю дзеля шмат якіх абвінавачваньняў на адрас Цэнтру: вось жа, Цэнтр створаны дзеля ўдасканальваньня чалавечага лёсу й дасягненьня ўсеагульнага шчасьця, а тут два супрацоўнікі, якія працавалі ў адным кірунку, нат не былі прадстаўленыя адзін адному! Нашыя анёлы, абураныя такою непрафесійнасьцю нябёснага кіраўніцтва, прыймаюць угоду. Яны*

*дамаўляюцца скантактавацца ў першы працоўны дзень – Дзень Раздачы, ды расказаць кіраўніцтву аб сваім праекце.*

*А праект яны распрацавалі гэткі (седзячы там, пры браме). Называецца ён “Шчасьлівае каханьне” й мае на мэце прадэманстраваць сьвету магчымасьць паразуменьня ды зрабіць двух чалавек абсалютна шчасьлівымі. Праект ужыцьцяўляцьмецца такім чынам: наш анёл бярэ пад абарону дзяўчынку, ягоны новы сябар – хлопчыка. Гэтыя дзеці народзяцца ў Парыжы, сустрэнуцца, пакахаюць адно аднога, возьмуць шлюб, народзяць дзяцей, лёс іхні будзе ідэальным, і памруць яны ў адзін дзень, трымаючыся за рукі. Такім чынам, чалавецтва атрымае цудоўны прыклад шчасьлівага каханьня, а нябеснае кіраўніцтва – узорны прыклад скаардынаванае працы з найлепшымі вынікамі.*

*Тут адчыняецца брама; анёлы абменьваюцца нумарамі тэлефонаў, дамаўляюцца сустрэцца на Раздачы ды кідаюцца ў абдымкі сваіх выхаванцаў.*

*І вось адпачынак ідзе пад канец. Надыходзіць Дзень Раздачы. Але наш анёл нечакана ўсё псуе. Напярэдадні ён злоўжываў амброзіяй, не пачуў будніка ды прыляцеў у Цэнтр з вялікім спазьненьнем. Усе іншыя анёлы ўжо выходзяць з офіснага будынку Цэнтру ды лятуць, каб пабыць пры народзінах сваіх немаўлятаў.*

*Сябар нашага анёла, разьюшаны, падлятае ды пачынае яго трэсьці:*

*– Што ты нарабіў! Ты ўсё сапсаваў! Ты прыйшоў самым апошнім! Ведаеш, дзе нарадзілася твая дзяўчынка? Заміж Парыжу – такое эксклюзіўнае месца страцілі, я табе яго трымаў да апошняга моманту! – заміж Парыжу яе запхнулі ў краіну “Пакараньні за грахі ў мінулым жыцьці”! Я ледзь запомніў назву ейнага гораду! Бог, дарэчы, таксама, як пералічваў гарады, на яго забыўся... Як жа... У нейкі... Гомель! Ведаеш, як гэта далёка ад Парыжу? Што мы зараз рабіцьмем?*

*Анёлы-абаронцы сядаюць у роспачы на лаўку. Наш трымаецца за галаву: і без таго яму кепска, а тут яшчэ патрэсьлі. І раптам да яго прыходзіць нейкая ідэя: ён пачынае шчасьліва й загадкава ўсьміхацца.*

*– Слухай! Анічога я не сапсаваў! Так будзе нават лепей! Мы зробім усё магчымае дзеля іх сустрэчы! Гэта будзе яшчэ больш жыцьцесьцьвярджальна – пераадолець гэтулькі перашкодаў і нарэшце сустрэцца ў Парыжы, каб ніколі больш не растavацца! Усё адно яны спаткаюцца!*

*І нашыя анёлы, поўныя энергіі ды натхненьня, лятуць сустракаць сваіх дзяцей з нябыту.*

*Наш анёл застаецца задаволены: не такі ўжо благі лёс мае ягонае дзяўчо. Сям’я добрая, бацькі прыгожыя, першае дзіця, пяцёра чалавек скачуць вакол яе. Але анёл пачынае найцікавейшую ды найскладанейшую частку свайго плану.*

*Па-першае, трэба, каб дзяўчынка валодала францускаю моваю. Высьвятляецца, што ў забытым Богам горадзе Гомлі ўсяго толькі адна школа з паглыбленым вывучэньнем францускае, і месьціцца яна досыць далёка ад цудоўнае, вялікае кватэры нават не дзяўчынчыных бацькоў, а ейных бабулі з дзядулем. І наш анёл пачынае ствараць нагоды дзеля кватэрнага абмену. Ён лётае, што шалёны, дамаўляецца з іншымі анёламі-абаронцамі, і ў выніку ягоных махінацыяў у дзядзькі гэтае дзяўчынкі, які таксама*

*жыве ў той самай вялікай кватэры, нечакана зьяўляецца жонка. Ня проста жонка, а жонка з дзіцем – анёл шукаў такую. Спачатку хацеў нават з некалькімі дзецьмі, але дзядзькаў анёл-абаронца не дазволіў ламаць яму лёс.*

*Такім чынам, у кватэры аказалася прапісанаю процьма народу: бабуля й дзядуля нашае дзяўчынкі, ейныя бацькі, дзядзька з жонкаю ды дзіцем. Яны самі прыйшлі да высновы: трэба разьменьваць кватэру.*

*Усё, што адбываецца далей, нагадвае показку: наш анёл перакваліфікоўваецца ў рыэлтара. Ён заляпляе ўсе Нябёсы абвесткамі: “Шукаю двухпакаёвую кватэру ў Гомлі ў раёне школы з паглыбленым вывучэньнем французскае мовы”. Нарэшце кватэра знойдзеная, і нашая дзяўчынка, з кветкамі ды белымі бантамі ў косах, ідзе ў першы клас.*

*Анёл адпачываў гадоў шэсьць-сем, выконваючы паціху свае абавязкі. Зьлётаў пару разоў у Парыж паглядзець на сябравага хлопчыка: нічога, расьце! Прыкладаў намаганьні дзеля атрыманьня нашаю дзяўчынкаю выдатных адзнакаў, сачыў за ейным выхаваньнем, бараніў ад шкодных уплываў кепскіх кампаніяў...*

*Але аднаго дня, як гром з яснага неба, паўстала вялікая праблема: Першае Каханьне!*

*Наш анёл у трансе. І праўда, як ён мог забыцца на такую простую, але немінучую рэч? Анёл-абаронца палічыў, што падаў дзяўчынцы дастаткова знакаў, каб тая прадбачыла свой лёс: французская школа, выдатныя здольнасьці, зрэшты, прыгажосьць... Але ён не ўлічыў, што людзі збольшага – песімісты й ня схільныя давяраць нават сваім вачам, ня тое што нейкім няпэўным знакам. Наш анёл ліхаманкава разважае, што зрабіць, але нічога ня робіць. Зрэшты, што рабіць? Махнуць рукою ды зладзіць ім шчасьлівае каханьне – дык яна пра Парыж і думаць ня будзе! А забараніць ёй кахаць – вырасьце жорсткай і цынічнай, і Лёсу свайго банальна не спазнае.*

*Выйсьце анёлу падказвае ягоны сябар.*

*– А чаго тут разважаць? Я са сваім ведаеш, як жорстка? Каханьне без узаемнасьці – вось выйсьце! Хай кахае сабе на здароўе! Без узаемнасьці – цудоўна! Ня будзе затое разьменьвацца на дробязі. Моцна, балюча – хай! Хай пакутуе! Можа, які талент адкрыецца. Ты, дарэчы, удакладні ў Цэнтры, колькі ў іх рэзервовых талентаў яшчэ ёсьць. Хай вучыцца дзіця кахаць – кожны пачуцьцёвы досьвед толькі на карысьць ідзе. Дарэчы, абвесткі ў Цэнтры чытаў? У суботу ў тваім горадзе будзе гарэць тралейбус з пятнаццацю пасажырамі – глядзі, каб твая туды ня трапіла. А то з маім суседам надоечы такое адбылося!.. Замест бацькі да нас выправіўся ягоны сын, а ён мусіць быць прэзідэнтам Конга праз трыццаць гадоў. Такі скандал быў! Няўжо ня чуў?..*

*І наш анёл пакідае ўсё як ёсьць. За першым безузаемным каханьнем, якое самое сябе вычарпала да заканчэньня дзяўчынкаю школы, ён рыхтуе другое: ня менш безузаемнае й нашмат мацнейшае. За другім – трэцяе, за трэцім – чацьвертае... І гэтак далей, пакуль не надыдзе зацьверджаны Цэнтрам час Скрыжаваньня Лёсаў.*

*Тым часам дзяўчынка сталее, разумнее, набіраецца жыцьцёвага досьведу й пачынае задаваць Нябёсам нетрывіяльныя пытаньні: штосьці са*

*мною ня так? Ёй цяжка зразумець, як такое можа быць: яе, такую прыгожую ды разумную, ніхто не кахае? Анёл, як можа, дапамагае ёй: у дзяўчынкі зьяўляюцца цудоўныя сябры, жыцьцё поўніцца падзеямі... Анёлу крыўдна, што, маючы такія дарункі Лёсу, дзяўчынцы ня сорамна скардзіцца!..*

*Анёл, да таго ж, робіць усё магчымае, каб дзяўчынка ня мела непарыўных сувязяў са сваім родным горадам: ніякай удалай кар'еры, ніякай кар'еры агулам! Бо цяжка будзе ўсё кінуць ды зьехаць назаўжды ў Парыж.*

*І раптам здараецца нечаканае. Анёл, хоць і анёл, але захварэў. Ён зламаў крыло, а гэта найгоршае, што можа адбыцца з анёлам. У яго гарачка, ён ляжыць непрытомны, а на ягонае месца часова прызначаюць намесьніка.*

*Намесьнік-абаронца, ведама, не азнаёмлены з праектам, глядзіць долу ды жахаецца. Глядзіць ён уніз, і што ён бачыць? Дзяўчына, такая цудоўная дзяўчына, няспынна скардзіцца на жыцьцё. І, дарэчы, небеспадстаўна: добрая, прыгожая – і ніхто не кахае; адукаваная, разумная – і дагэтуль не ўладкаваная на прыстойную працу. І ён хуценька бярэцца за разьвязаньне праблемаў.*

*Дзяўчына лётае як на крылах. Літаральна ў адзін момант усё ў жыцьці зьмянілася: вяртаючыся з новае працы, яна трапляе пад дождж, і з туману да яе выплывае сярэбраны крайсьлер, кіраваны траха ня прынцам. У ЗАГС пададзеная заява, і ўжо нават зарэзерваванае месца для дзіцяці, якое мае быць зачаткаваным праз некалькі месяцаў.*

*Калі праз чатыры чалавечыя месяцы наш анёл выходзіць на працу, надыходзіць ягоная чарга жахацца. Ён адразу ж бярэцца выпраўляць становішча. Аддзел Нараджэньня Дзяцей з вялікаю неахвотаю, але пераносіць месца народзінаў немаўляці, і ў патрэбны час зацяжрвае ня нашая дзяўчынка, а, каб далёка не хадзіць, ейная сяброўка.*

*Надыходзіць час наважыцца зрабіць найскладанейшае. Наш анёл з сябрам сядзяць на прызьбе нябёсаў і з тугою глядзяць долу.*

*– Шкада яе... Такая шчасьлівая...*

*– Нічога! Перажыве як-небудзь...*

*Але не, не перажыла. Нашая дзяўчынка, у поўнай разгубленасьці ад таго, што яе зьнячэўку, без аніякіх тлумачэньняў, звальняюць з працы ды кідае каханы чалавек, занураецца ў глыбокую дэпрэсію, выпівае пэўную колькасьць таблетак ды трапляе на вочы апосталу Пётру.*

*Нашым анёлам пачынае цікавіцца Цэнтр, і яго выклікае найвышэйшае кіраўніцтва. Самагубства – гэта Надзвычайнае Здарэньне, за якім хаваецца такое словазлучэньне, як "прафесійная неадпаведнасьць". Анёлу-абаронцу гэта пагражае ня толькі вызваленьнем ад пасады, але выгнаньнем з Нябёсаў ды ператварэньнем у чалавека. Адбываецца вельмі напружаная гутарка з кіраўніцтвам, на якой уздымаюцца глабальныя пытаньні ды абмяркоўваюцца паняткі "лёс", "шчасьце", "мэта" й "сродкі". На гэтым паседжаньні Цэнтральнага Камітэту нашага анёла бароніць сябар, і яны ўдвух адстойваюць сваю пазіцыю. Цэнтр, на шчасьце, урэшце з разуменьнем паставіўся да Праекту, анёлаў ставяць у прыклад усім калегам, і Дзень Скрыжаваньня Лёсаў пераносіцца на блізкі тэрмін. Дзяўчынку вяртаюць назад, на вялікае зьдзіўленьне брыгады рэаніматараў, і ў якасьці падарунку суцяшаюць яе, раней нязадоль-*

*ную правільна прасьпяваць "Чыжыка-пыжыка", выдатным каларатурным сапрана. А брыгада рэаніматараў адразу ж складае чарговую байку пра "прыхаваныя рэзэрвы чалавека ды іх выяўленьне пасьля клінічнае сьмерці".*

*Дзяўчына абуджаецца ды сьпявае, сьпявае, сьпявае... Неўзабаве яна ўжо пяе ў эстрадным тэатры, тэатр едзе на гастролі ў Парыж, у Парыжы яна – о нешчасьлівы лёс! – адразу губляецца, і першым жа чалавекам, да якога яна зьвяртаецца, каб спытаць дарогу, становіцца наш доўгачаканы хлопчык.*

*Happy end, нашыя анёлы нясьпешна шпацыруюць побач з закаханымі ўздоўж Сены, падаюць зоркі, гучыць музыка, заслона. Воплескі пераходзяць у авацыю".*

Такі вось цудоўны сцэнар; шкада, што я ніколі не пабачу фільму.

А сцэнар, дарэчы, створаны на "ўласным матэрыяле"! Я маю на ўвазе свайго хлопчыка з Парыжу, з якім у нас ужо цэлыя два месяцы доўжыцца палкі віртуальны раман. Праўда, мяне крыху бянтэжыць той момант, што мы адно аднога ніводнага разу ня бачылі (фоткі ня лічацца).

Вельмі характэрная для мяне гісторыя. Калі ў нашых шыротах ня вядуцца прынцы, а белыя коні пагатоў, застаецца шукаць хлопчыкаў у Парыжы. Правільна, нашто мне Брэтань, Эльзас ды Латарынгія? Парыж – самае тое. Я толькі дзіўлюся: чаму ня Рыо-дэ-Жанейра?

Я ж кажу, гэта вельмі характэрна для мяне: прыдумляць сабе каханьне на пустым месцы. Лухта, што хлопчык віртуальны. Затое я цяпер з усёю шчырасьцю магу абвяшчаць паспалітаму люду, што ў мяне быў раман з хлопчыкам з Парыжу, і што ён мяне запрашаў прыехаць... Але я не паехала... Дарэчы, нічога яшчэ ня вырашана. Мо', паеду...

Як Заратустра глядзеў на людзей і дзіву даваўся, гэтак і я назіраю за сабой ды ўвесь час дзіўлюся. Трэці год, дзень за днём, я ўсё глыбей занураюся ў свае мроі ды летуценьні, у павуціньне сваіх пачуцьцяў – пачуцьцяў, народжаных тымі самымі мроямі. Адныя прывіды. Я й сама ператвараюся ў здань ("Ma chere fantom" – піша мне Ніко), і ўсіх іншых успрымаю гэтаксама.

І небеспадстаўна. Да прыкладу: з майго жыцьця зьніклі мужчыны. Рэальныя жывыя мужчыны, да якіх можна мець чалавечыя пачуцьці. Я не перабольшваю: зьніклі! Я сутыкаюся з імі паводле жорстка знармаванага графіку: уранькі, ідучы на працу, мінаю вялікую кампанію прадстаўнікоў процілеглага полу. Кампанія стаіць ля крамы з пляшкамі ў руках ды праводзіць мяне позіркам, як па камандзе павольна паварочваючы галовы. Вялізнае пачварнае мужчынскае цела: дваццаць галоваў і сорак ног, яно мычыць і бэкае. Штоpазу ў мяне ўзьнікае жаданьне ўзяць АКМ ды расстраляць іх "на ўскідку". (Прызнаюся: маю ідэю цікавае акцыі – "Зрабі горад чысьцей – забі алкаголіка!")

Гэта – першая мая сустрэча з мужчынамі. Другая – на працы: у нашай школе пяць мужчынаў, адзін з іх – мой бацька, іншыя ўспрымаюцца як настаўнікі. Ня буду нават тлумачыць. Жудасная рэч – працаваць у вялікім жаночым калектыве: мужчынскае ў ім распускаецца, як цукар у гарбаце.

Ня ведаю, ці засталіся ў нас апошнія фарпосты патрыярхату – усё адно гэтыя адэпты ня маюць аніводнага шанцу сьцьвердзіць сваю пазіцыю. У мяне склалася ўражаньне – не, гэта ня ўражаньне, гэта рэальнасьць! – што ў нашай краіне працуюць толькі жанчыны. Ува ўсіх канторах, ува ўсіх планавых аддзелах, ува ўсіх бухгалтэрыях – паўсюль! – працуюць адныя жанчыны. Спадарства, у нас матрыярхат. Самы сапраўдны матрыярхат, і гэта так, і з гэтым не паспрачаецеся. Мой дзень мінае ў атачэньні кабетаў. А ўвечары адбываецца мая трэцяя сустрэча з мужчынамі. Я іх ужо бачыла ўранку. Толькі цяпер яны не стаяць ля крамы – ляжаць.

Таму мне толькі й застаецца, што забаўляцца са зданямі. Успамінаць Севачку. Пісаць вялікія лісты Ніко. І – што найгалоўнейшае – застаецца шмат часу на сябе. Балазе, гэта вельмі зручна – такія прывідныя каханьні. Нібыта не адна – але затое няма ніякіх праблем ня тое што з мыцьцём нечыіх шкарпэтак (я ведаю, чаго больш за ўсё баяцца фемініст-кі – шкарпэтак!), а нават з узаемапаразуменьнем. У мяне з маімі вір-туальнымі каханкамі выдатнае экстрасэнсорнае ўзаемапаразуменьне – мы ніколі не спрачаемся.

У сувязі з тым, што мне, па вялікім рахунку, няма куды сябе падзець, я стаўлю на сабе эксьперыменты – з мэтаю самаўдасканаленьня. Апошні эксьперымент быў вельмі плённы – я такіх вынікаў ад сябе не чакала.

Я назвала гэты эксьперымент “Апошняй спробай звычайнага побытавага каханьня”. У веку дваццаці аднаго году я, фактычна на самоце, заўважыла: усе мае мінулыя “безузаемныя каханьні“ пакінулі па сабе ў найлепшым выпадку па некалькі згадак кожнае. Дык што, Аліса, спыталася я ў сябе, што застаецца ад казкі потым, пасьля таго, як яе расказалі? Што застаецца? Няўжо жыцьцё папраўдзе большае за каханьне?

Пэўна ж, так, адказала я сабе. “Свято место пусто не бывает” – рэзонна зацеміла я й стала чакаць. І вось прычакала. Пры канцы кастрычніка на працу прыйшоў рахунак за тэлефон, надта ж вялікі, і я выправілася ў раённы аддзел адукацыі – пералічваць грошы. Я ведала, што тэлефоннымі рахункамі займаецца Аліна, але не магла падумаць, што ў такой маленькай канторы ажно два рэвізоры.

Пры такіх вось акалічнасьцях у маім жыцьці зьявілася загадкавая постаць Рэвізора.

На маё пытаньне “Дзе рэвізор?” Аня адказала: “У пятым кабінеце”. Я, крыху зьдзіўленая нечаканым пераездам Аліны, ламанулася ў дзьверы з шыльдачкай “5” і ад нечаканасьці зьбянтэжылася. Хлопец, які сядзеў пры стале, імгненна зрэагаваў на мой дзівакаваты выгляд: ён засьмяяўся. Уяўляю сябе з боку: урываецца ў кабінет дзяўчына ды, замiж вітаньня, пачынае лыпаць вачыма. Я таксама засьмяялася, нарэшце ўвайшла ды выклала на стол паперы.

Гэта называецца “coup de foudre”[1]. Кароткае замыканьне. Нейкая сувязь між людзьмі, якая ўзьнікае імгненна. Я ня схільная верыць ва ўсялякую містыку накшталт “роднасных душаў”; напэўна, гэта абу-

---

[2] Удар маланкаю (фр.) – «каханьне з першага погляду».

моўлена нейкімі хімічнымі рэакцыямі, нячутнымі пахамі... Мы абое былі зьбянтэжаныя: я – з таго, што ніколі яго раней не спатыкала, выдатны хлопец, можна сказаць, прывабны; ён – з тае ж нагоды, мяркую: я даволі эфектна выглядала. Перапісваючы мне квітанцыю, ён сапсаваў ажно тры бланкі; засяроджана стукаючы па калькулятары, ён раптам узьняў да мяне вочы ды сур'ёзна сказаў: "Я зьбіўся. Усё праз Вас".

З канторы я вылецела як на крылах. Зацёрты выраз, але найдакладнейшы. Цэлы тыдзень я мела цудоўны настрой – і я ўжо здагадвалася, чым гэта скончыцца.

Усе мае наступныя візіты ў кантору ператварыліся ў суцэльнае нерваваньне ды калаценьне рук, сэрца ды каленак: сустрэну ці не сустрэну? А што ён скажа? І што будзе?..

Ну натуральна, што не сустракала – ён рэдка выходзіў з кабінету. І мой спачатку добры настрой зьмяніўся нечым, вельмі падобным да псіхозу. Я з нездаволенасьцю адсочвала ўзьнікненьне у сябе змрочных думак на прадмет "нешчасьлівага лёсу" ды "ўсё, як заўсёды, анічога ня здарыцца, анічога ня зьменіцца".

Мне такі расклад вельмі не падабаўся. Я была з сябе вельмі нездаволеная. Ёлкі-палкі, ну колькі можна! Варта было рабіць такія вялікія намаганьні дзеля дасягненьня нутраной гармоніі, каб некалькіх позіркаў хапіла не закахацца, не! На нейкую стэрэатыпную схему каханьня, да якой мае пачуцьці ўжо былі звыкнуўшыся. "Хилый закос под любовь" – сьпяваў БГ і меў рацыю.

Я на сябе злавала. Мне хацелася спакою. Мне не падабалася гэтая мітусьня дзеля зусім незнаёмага чалавека. Я пачала з гэтым змагацца. Я завяла дзёньнік, дзе штовечара прагназавала наступны дзень. Я зьдзеквалася ды сьмяялася сама з сябе, бязьлітасна апісваючы ўсе мае пачуцьці ў залежнасьці ад меркаваных падзеяў наступнага дня. Выглядала гэта прыкладна так: "Я прачынаюся ў добрым настроі. Улучаю музыку, сьнедаю, іду на працу. Мне паведамляюць, што сёньня трэба ехаць у кантору. Я пачынаю нервавацца, палка жадаючы сустрэць там Рэвізора. У канторы я бегаю па кабінетах, мае рукі калоцяцца, твар гарыць. Ёсьць два варыянты разьвіцьця падзеяў. Першы: я яго не сустракаю. Выходжу з канторы засмучаная, палю ля ўваходу з рэшткамі спадзяваньня: "Вось зараз ён выйдзе..." Ён не выходзіць. Я іду да прыпынку, раз-пораз азіраючыся. Расчараваньне. Фрустрацыя. Прыходжу дахаты нібыта прыбітая, ладжу скандал праз нейкую дробязь. Другі варыянт: я яго сустракаю. Мы вітаемся ды разыходзімся ў розныя бакі. Я выходжу з канторы засмучаная... Глядзі варыянт першы. Ёсьць яшчэ трэці шлях: у калідоры Рэвізор спыняе мяне пытаньнем кшталту "Каторая гадзіна?" Я кажу, што шчасьлівая, гадзіньнікаў ня маю, ён кажа, што таксама шчасьлівы, я пытаюся, з якое нагоды, ён адказвае: "Бо нарэшце сустрэў Вас..." І далей па тэксьце. Імавернасьць такога разьвіцьця падзеяў – 0,1 адсотку. Можаш нават не спадзявацца".

Я прэпаравала свае эмоцыі як паталагаанатам. Я малявала схемы ды графікі. Праз месяц я ўжо мела ўсе стэрэатыпы маіх пачуцьцяў ды паводзінаў. Я складала з іх табліцы: "Стандартны дзень без паездкі ў кантору", "Нярвовы дзень з паездкай у кантору без сустрэчы з Рэвізо-

рам", "Звышнярвовы дзень майго сутыкненьня з Рэвізорам у бухгалтэрыі", "Супернярвовы дзень майго беспасярэдняга сутыкненьня з Рэвізорам з нагоды пералічэньня рахунку. Здараецца раз на месяц".

Праз два месяцы я з радасьцю адчула, што нешта зьмяняецца. Дакладней, зьмянялася я сама. Мае эмоцыі, загадзя спрагназаваныя, не вытрымлівалі свае стэрэатыпнасьці ды зьнікалі. Цяпер не яны валодалі мною: я кіравала імі як хацела. "Ну-ну, дзе маё вялікае расчараваньне? Дзе халодны пот на сьпіне?" Цяпер я пэўна знала: варта мне толькі сказаць самой сабе: "Такое з табой ужо было", як любое перажываньне выяўляла сваю існасьць мыльнае бурбалкі ды лопалася ў паветры. Я адчувала ў сабе нейкую новую, незвычайную пэўнасьць, моц, якую ня ведала куды падзець. Я недзе падсьведама адчувала, што з гэтымі сіламі можна нарабіць розных вялікіх справаў.

Тым часам мае табліцы папаўняліся новымі схемамі: "Сустрэча Новага году на галоўным пляцы са спадзевам сутыкнуцца з Рэвізорам і вялікім смуткам ранкам з нагоды несустрэчы", "Дзень народзінаў Дыяны з сузіраньнем шчасьлівых парачак і вялікім смуткам дарогаю дадому". Але з дня народзінаў мяне праводзіў дахаты бойфрэнд адной з дзяўчатаў, які плакаўся ў маю камізэльку аб іхніх праблемах; ураньні пасьля Новага году ў мяне ўзьнікла толькі два жаданьні: трапіць у лазенку ды заснуць... Карацей, жыцьцё стала нашмат цікавейшым ды непрадказальным пасьля таго, як я скінула з сябе кайданы выпрацаваных у юнацтве стэрэатыпных эмоцыяў. Цяпер можна было проста жыць. Жыць, радавацца любым праявам жыцьця, маючы з гэтага невычэрпную асалоду. Я паціснула руку самой сабе ды сама сябе павіншавала з перамогаю над сабою ж.

Супакоеная, суцішаная, я азірнулася навокал. І пабачыла таго самага Рэвізора – нармальнага хлопца, да якога цяпер можна было спакойна падысьці ды пазнаёміцца.

Але прысьпеў час зьязджаць у Менск на два тыдні – здаваць сесію. Адразу па вяртаньні я нарэшце запланавала шчыльнейшае знаёмства з Рэвізорам, а на працягу сесіі я пастанавіла па ім сумаваць. Каб цікавей жылося. Каб кожны мой позірк у любое акно меў глыбіню й няўцямную журбу. Каб зьявілася хоць якое натхненьне, урэшце.

Сумавала я па ім роўна два дні. Дакладна да тае хвілі, пакуль мне не патэлефанаваў Севачка.

Я й цяпер ня ведаю й нат не здагадваюся, якія матывы вымусілі яго выклікаць мяне з нябыту. Крыху больш за два гады мы былі разьвітаўшыся з Севам, вельмі нездаволеныя адно адным, і ня бачыліся з таго часу, перыядычна ўзьнікаючы ў плётках ды чутках нашых агульных знаёмых. Мы афіцыйна былі пасварыўшыся. І раптам, зусім нечакана, ён патэлефанаваў мне ды запрасіў у госьці. Дакладней было б сказаць: загадаў прыехаць. І я, насуперак усім сваім прынцыпам, апранулася ды выйшла ў пранізьліва-халодную студзеньскую амаль ноч.

Мой Сусьвет Няспраўджаных Жаданьняў бразгаў іржавым жалезам; яго прадзімалі халодныя вятры, ён быў нават не асьветлены, а запэцканы хваравітым сьвятлом ліхтароў. Я ехала ў чорным аўтобусе, спра-

буючы сагрэць на жываце рукі. Я ўпершыню за колькі гадоў ехала на ноч да мужчыны ды спрабавала ўспомніць: што я мушу адчуваць, едучы да мужчыны на ноч? І не магла нічога згадаць. Сітуацыя ўскладнялася тым, што нашыя стасункі з Севам былі абсалютна няпэўныя. Хто мы адно аднаму? Сябры? Каханкі? Колішнія аднагрупнікі, якія аднойчы – усяго толькі аднойчы! – нарабілі глупстваў, якіх стала досыць на год плётак ды показак усёй кампаніі? Ды проста ніхто. Ты мне, я табе – lupus est.

Тым ня менш, Сева сустрэў мяне на вакзале. Мы прыехалі да яго й доўга яшчэ вячэралі, цягнулі бясконцае піва ды такія самыя размовы – бяз мэты, без канца ды без пачатку. Усё вялося да таго, што мы – проста старыя знаёмыя, вось зараз датрываем да трэцяе гадзіны ночы ды пойдзем спаць: ён – на ложак, я – на канапу.

... Я прыхільніца непапулярнай у шырокіх масах тэорыі бясконцага часу. "Што такое Імгненьне ў параўньні з Вечнасьцю? Тое самае!" – дэкламаваў перад паснулай аўдыторыяй выкладнік культуралогіі, а я, паклаўшы галаву на рукі, не магла адвесьці ад яго вачэй: я была ўражаная тым, што плён нашых начных гутарак з Ірай мае навуковы грунт. Імгненьне й Вечнасьць – тое самае. Усё, што адбылося й адбудзецца некалі, так і адбываецца вечна ў тым самым часавым адцінку, і машына часу – гэта рэальнасьць, і кожны мае яе спрошчаную мадэль. Гэта – памяць. Існуюць такія імгненьні, нібы вытатуяваныя на сетчатцы, нібыта высечаныя ў мазгах як барэльефы ў граніце. Заплюшчваеш вочы – і бачыш, бачыш... Аднойчы ўлетку аўтобус спыніўся пасярод вуліцы, да дзьвярэй у вадзе; спыніліся ўсе машыны, ня здольныя супрацьстаяць навальніцы. І раптам фіялетава-чорныя хмары прарваліся, і ў прарэх на ўвесь горад палілося ліпеньскае гарачае сонца, і выгнулася вясёлка праз усё неба. І ўсе людзі, зачараваныя, паднялі да неба галовы, і ўсе пабачылі, як цэлая птушыная чарада, хлопаючы крыламі, імкнецца проста да сонца. Я й цяпер заплюшчваю вочы ды бачу: тыя птушкі ўсё лятуць, лятуць...

З нашае сустрэчы з Севам мая памяць занатавала толькі невялічкі адцінак, дзьвюххвілінны фільм, які я цяпер магу сабе паказваць бясконца. Мы ўжо сядзелі на канапе, і я найграна-весела абуралася з нейкае нязначнае нагоды, калі Сева спыніў маю фразу, проста закрыўшы мне рот рукою. Пасьля ён моўчкі забраў маё піва ды зьняў з мяне акуляры.

Хвіліны дзьве мы проста сядзелі моўчкі, пераплёўшы рукі, з заплюшчанымі вачыма, нібыта спрабавалі пачуць між уласных шумлівых думак перастук нашых сэрцаў.

Усяго толькі дзьве хвіліны, дзьве хвіліны пачатку, – мы былі пяшчотныя. Мы былі пяшчотныя – вось у чым рэч! Пяшчотныя – і справакаваў гэта Сева. Нашто ён гэта зрабіў? Мяркую, што *проста так*. Сваёй пяшчотай ён сьцягнуў з мяне ўсю маю складаную амуніцыю: і легіянерскі панцыр са шчытом і мячом, і рыцарскія дасьпехі, і бронекамізэльку з процігазам. Показка ў тэму: "Я грынпісавец. Я вызваляю чарапашак. Я вызваляю іх ад панцыру". І вось я, голая чарапашка, заплюшчыла вочы, лягла на сьпіну ды паплыла па гэтай плыні нечаканае пяшчоты, спрабуючы ня думаць, да якога берагу мяне на раніцу прыб'юць хвалі.

Ня думаць – бо я была добра знаёмая з пранізьлівай пустэчай

сьвітанкаў у чужых кватэрах. На прамарожаным грамадзкім транспарце а восьмай раніцы мы разьехаліся ў розныя бакі.

Я цудоўна ведаю, чым было абумоўленае маё нежаданьне аналізаваць сітуацыю, змагацца з пачуцьцямі ды ўдаваць з сябе шчасьлівую. Я была стомленая напружанымі заняткамі з раніцы да позьняга вечару, а таксама неўладкаваным побытам у чужой кватэры: мы з Іркай здымалі пакой. Да таго ж, было вельмі халодна, і таму я, седзячы на занятках, увесь час правальвалася ў той дзьвюххвілінны ўспамін цёплае пяшчоты. У тыя ж дні я й выціснула з сябе абзац "Раніца безь цябе". Мне пранізьліва захацелася прачынацца побач з кім-небудзь жывым і цёплым. Ну а тое, што Сева аказаўся рэальнейшым за Рэвізора, – гэта абумоўлена тэрытарыяльным фактарам. Севу, прынамсі, я магла патэлефанаваць.

Ці самой чакаць ягонага званка. Чым я й заладоўвала сабе мазгі. Чаканьне, чаканьне... У пятніцу, а шостай раніцы, я сустракала Іру на вакзале: ейную торбу, закамплектаваную бацькоўскімі харчамі, немагчыма было падняць. Мы спыніліся адпачыць ды выпаліць па цыгарэце перад уваходам у метро, і я, штурхануўшы торбу нагой, злосна перапыніла Ірчыны развагі наконт апошніх падзеяў: "Іра! Ён не тэлефануе не таму, што ў яго зламаўся тэлефон, не таму што ён заняты з раніцы да глыбокае ночы, не таму, што ён сарваў голас, сьпяваючы ад вялікае радасьці марш Мэндэльсона. Ён мне не тэлефануе, бо ня хоча мне тэлефанаваць – вось і ўсё, і разважаць на гэтую тэму я больш не зьбіраюся".

Але я разважала. А калі пайшоў трэці дзень, я пачала разважаць уголас і бесьперапынна, ды так, што Іра, кінуўшы ў мяне канспектам, абвясьціла:

– І патэлефануй! Ну давай, тэлефануй яму! А чаму не? Ты што, пакінутая каханка? Ці абражаная ў найлепшых пачуцьцях цнатлівіца? Патэлефануй. Даведайся, як маецца.

Іра мяне пераканала. Я дачакалася, пакуль яна зьнікне ў невядомым кірунку, ды набрала нумар, які ўжо пасьпеў занатавацца ў маёй памяці.

Размова была хвілінная: мы проста дамовіліся заўтра сустрэцца.

Дарэмна я гэта зрабіла. Дарэмна тэлефанавала, дарэмна ехала, стомленая, выціснутая пасьля іспыту як лімон, праз увесь горад на ноч гледзячы.

Бо ўначы між намі адбылася цікавая размова працягам у гадзіну. Дакладней, прамаўляў Сева, а я ляжала ды слухала. Я ляжала ды думала: "Божа, Сева, як банальна, як банальна, Сева!" Я нават пачынала зьбівацца на абдумваньне скорага іспыту з эканамічнае тэорыі: ці варта рабіць шпоры альбо ўдасца працягнуць падручнік?

Божа, колькі разоў я слухала такія дэкламаваньні! А колькі разоў сама была аўтарам гэткіх прамоваў!.. Адзін чалавек не кахае другога ды пачынае бараніцца ад чужога каханьня. Ставіць складаныя абарончыя збудаваньні вакол сваёй свабоды. О, я так і ведала, пачынае расказваць пра свой складаны характар. Дарагі мой, не было цябе пры

праявах маёй індывідуальнасьці! Разбэшчаная, разьюшаная, пакрыўджаная, проста стомленая (патрэбнае падкрэсьліць) Югася стаіць пасярод пакою, тупае нагамі ды крычыць “А-а-а-а-а-а-а-а-а!!!”, а вакол яе скача ўсё сямейства, сьпяваючы хорам ёй дыфірамбы – каб толькі не пачала кідацца посудам. Гэта ў агульных рысах, а хочаш падрабязнасьцяў? Распытай маіх брацікаў ды колішніх бойфрэндаў: яны табе раскажуць, якая я “тонкая натура” ды як мяне трэба ахоўваць ад праяваў гэтага варожага сьвету. Яны таксама могуць падзяліцца досьведам, як самому сьвету трэба бараніцца ад маіх праяваў: казаць мне штодня, што я – найлепшая, найпрыгажэйшая, найразумнейшая: жывы геній сучаснасьці!

О! А цяпер Сева расказвае пра свае звычкі! Цукар можна браць толькі адмысловай лыжачкай. Ложак засьцілаецца з дапамогаю геадэзічных прыладаў. Філіжанкі ў буфеце выстаўленыя ў шахматным парадку, кветачкамі арыентаваныя на паўночны ўсход, 48° 12'. Божа, Сева! Мая адсутнасьць звычак за дваццаць з хвастом гадоў таксама склалася ў непарушную сістэму! Пасту я прынцыпова выціскаю ўсёй рукой, і хай толькі хто-небудзь паспрабуе мяне ўпікнуць – і я прынцыпова разрэжу тубік напалову ды буду чэрпаць пасту пальцам. А ў кіданьні кухонных ручнікоў я дасягнула найвышэйшага майстэрства. Ці багата таленту трэба, каб акуратна скласьці рушнік? А што адбываецца на маім пісьмовым стале – гэта тычыцца мяне й толькі мяне! Звычкі ў яго, бачыце вы!

О! Перайшоў да выхваляньня ўласнымі разумовымі здольнасьцямі. Сева, дык ты ж проста мой партрэт! “Я люблю на самоце чытаць разумныя кніжкі, атрымліваючы задавальненьне ад таго, які я разумны!” Севачка, мне ніколі не забыцца на лета пасьля дзявятага класу, добрую частку якога я паклала на штудыяваньне “Анты-Дзюрынга”, штудыяваньне сумленнае, бяз пропуску старонак ды абзацаў, штудыяваньне з вельмі акрэсьленай мэтай: сузіраючы навакольны люд, упівацца хмельна-салодкай думкай: “А я чытала “Анты-Дзюрынг!” Каб, пагардліва адхіляючы заляцаньні аднагодкаў, скептычна адцеміць самой сабе: “Ды ён нават “Анты-Дзюрынга” не чытаў!”

Так, а што мы чуем цяпер? О, байку пра свае добрыя якасьці. Любы мой дружа Сева! Калі б мы з табой былі сапраўднымі сябрамі, ты даведаўся б, наколькі я адкрытая й шчырая са сваймі сапраўды блізкімі людзьмі. Як я абараняцьму кожнага з іх, нават калі давядзецца паўстаць супраць цэлага сьвету. А якія ў мяне канфармісцкія погляды на супольнае жыцьцё! Ведаеш, я нат пазбавілася феміністкага “комплексу шкарпэтак” – я ўважаю, што жонка павінна мыць мужавы шкарпэткі! Калі ўласнаручна мыеш свае, яшчэ адна пара надвор’я ня робіць.

А яшчэ я… Я яшчэ багата чаго. Табе гэта рупіць? Натуральна, не. Як і я ня маю да цябе ніякага клопату. Ты мне, я табе – lupus est. Ня бойся, Сева, не абараняй гэтак ад мяне сваю свабоду – яна мне непатрэбная. І ты мне непатрэбны. “Нашла каса на касу”. Два жывыя геніі сучаснасьці, два Цэнтры Сусьвету ня могуць існаваць побач: бо тады ім давядзецца пераглядаць ды перараблiць свае планетарныя сістэмы. Ды што я табе тлумачу – ты й сам гэта ведаеш.

Мне ў адно імгненьне абрыдла мая нядаўняя пяшчота. Я зноўку нацягнула на сябе ўсю сваю важкую непрабіўную амуніцыю. Сева, не тлумач мне, хто ты такі. Хіба я ня бачу – ты такі ж, як і я. Ты падобны да тых малюскаў, якія ў вялікай колькасьці поўзаюць на дне беларускіх рэчак. Усе дзеці ведаюць, як хутка яны захлопваюць палавінкі сваіх ракавак, як небясьпечна засоўваць у іх пальцы з рызыкай параніцца і як цяжка праламаць іх – нават каменем. Але ўсе дзеці таксама ведаюць: варта прасунуць між палавінак нож – і адкрываецца небясьпечнаму варожаму ветру бездапаможны далікатны малюск, якога варта толькі пазногцем зачапіць – і ён сьмяротна паранены. Сева! Што я, што ты – такія мяккія далікатныя малюскі, якія шчыльна захлопнулі свае ракаўкі ды гадуюць, тоячы ад сьвету, свае каштоўныя перлы, ахвяроўваючы на іх сваю перламутру.

Сева, я не зьбіраюся выцягваць цябе навонкі. Давай лепш спаць – у мяне заўтра адказны дзень.

Наважыўшыся заснуць, я ўбачыла, як не вытрымлівае выпрабаваньня рэальнасьцю мая нядаўна народжаная мроя прачынацца з кім-небудзь. Як аказалася, мая звычка спаць адной значна мацнейшая за мрою: ложак быў вузкі. Падушка была маленькая. Коўдра – гарачая. Каленкі стукаліся аб сьцяну. Рукі зміналі. І, як кульмінацыя, як кантус фірмус канцэрту “Мая спроба заснуць”, над усім загучаў Севаў забойны храп!

У мяне адразу зьявілася іншая мроя: узяць падушку ды коўдру ды перадыслакавацца на канапу. Гэтая мроя, як і належыць мроям, засталася няспраўджанай.

Я, пераможаная бяссоньнем, глядзела ў столь ды зноўку з галавой хавалася ў свой Сусьвет: акіян самоты, якая насамрэч ёсьць свабодай. Толькі я думала тады не пра свабоду, а пра тое, што ў мяне зьяўляецца жорсткасьць. Мой панцыр прырастаў да маёй скуры, мой процігаз рабіўся маім тварам. Ніколі. Больш. Ні з кім. Я. Ня буду. Пяшчотнай. НІКОЛІ! Я! НЯ БУДУ! ПЯШЧОТНАЙ!

А на наступны дзень у краіну прыйшла зіма – як зьдзек. Сапраўдная Зіма, якую я так чакала ўсе папярэднія месяцы.

Я ішла дамоў пешшу, перыядычна вызваляючы акуляры ад мокрага сьнегу, вытрасаючы сьнег з-за каўнера ды з рукавоў, правальвалася па калена ў суметы, якія павялічваліся на вачах, і было мне сумна. Тужліва. Можна сказаць, што я загойвала раны – ня раны нават, а так, драпіны. Мой нядаўні досьвед перамогі над уласнымі пачуцьцямі нарэшце нагадаў пра ся-бе – я заўважыла, што, па вялікім рахунку, мне ўсё адно. І калі я дацягну свой смутак дадому, я паспрабую induction ператапіць яго ў натхненьне.

Ня выйшла. Надоўга мяне не хапіла.

Я вярталася ў Гомель у дзень свайго нараджэньня – мне споўнілася дваццаць два гады. Ведама ж, Сева мне не патэлефанаваў – я й не спадзявалася.

А дома мяне чакалі такія падзеі, якія не пакідалі мне часу сядзець у куце, абхапіўшы каленкі, ды захлынацца ў сваёй адзіноце. Мая маці была ў шпіталі. Мой сабака, пакуль мяне не было дома, выправіўся да

сваіх сабачых продкаў. На працы рыхтаваліся да выбараў, і я, мала таго, што ўваходзіла ў склад камісіі, была яшчэ й сакратаркай, якая самастойна мусіла была выдрукаваць сьпісы. На маім участку чатыры тысячы чалавек, на суседнім – гэтулькі ж, прозьвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэньня, хатні адрас... Недзе на трэці дзень, дакладней, ноч, праведзеную на працы, я адскочыла ад кампутара, сьціснуўшы скроні, чым напалохала ўсіх: "Не магу! Болей не магу! Чакайце, я пяць хвілінаў адпачну..." Трэці тыдзень без выходных – гэта моцна. Дзяжурства на датэрміновым галасаваньні... І самі выбары: ноч з нядзелі на панядзелак, чатыры гадзіны раніцы… А ў панядзелак на працу. Чацьвёрты тыдзень без выходных.

І мною было зробленае яшчэ адно цікавае адкрыцьцё. Я на ўласным досьведзе праверыла старажытную прымаўку, што клін клінам выбіваюць. Ніякая сублімацыя, ніякая "замещающая активность", ніякія прабежкі раніцай, ніякія справы ад сьвітаньня да ночы не выратоўвалі мяне ад думак пра Севу. Уяўляю, калі б я наважылася бегаць раніцай – вось дзе я думала б пра яго бесьперашкодна! Млявыя, гультайныя, назольныя думкі – напаўжывыя, як зімовыя мухі. Я па ім сумавала, або рабіла выгляд, што сумавала… Клін вышыбаюць клінам: не рукой, не сякерай, ня палкай, а клінам, такім самым, раўназначным клінам – і нічым іншым. Неўзабаве – у сакавіку – адбылася падзея, верагоднасьць якой я ў лістападзе ацаніла ў 0,1 адсотку.

У чарговую маю паездку ў кантору ў калідоры мяне спыніў Рэвізор. Прычым усё выглядала так, нібы ён наўмысна мяне падпільнаваў, убачыўшы мяне ў акно.

"Каторая гадзіна, а Вы цудоўна выглядаеце, а Вам з белымі валасамі лепш, чымся з чорнымі (гэта ён пра мой парык), а сьпяшацца няма куды, хадзем да мяне піць каву!" І бліжэйшымі пяцьцю хвілінамі за каваю між намі адбылася даволі зьмястоўная гутарка, у часе якой мы перайшлі на "ты", высьветлілі, як каго клічуць, хто дзе жыве, хто дзе вучыўся, у каго якія планы на будучыню, які ў каго нумар тэлефону. А на наступны дзень я, злавіўшы Антона ў калідорах канторы, сама прапанавала яму разам ехаць дахаты: як аказалася, мы былі амаль суседзі.

Сорак хвілінаў, роўна сорак хвілінаў – уся дарога да дому – мы размаўлялі. Гэта была ня проста балбатня паміж калегамі – гэта быў флірт. З разьлікам на будучыню. Антон выразна даў мне зразумець, што ён ня мае дзяўчыны, і зрабіў пэўныя захады дзеля высьвятленьня наяўнасьці/адсутнасьці ў мяне бойфрэнда. Высьвятлялася таксама, хто чым цікавіцца ды дзе бавіць вольны час.

Я сказала: "Пакуль!" Я забрала ў яго маю торбу. Я выйшла на сваім прыпынку. Я прыйшла дахаты, ня зьняўшы ботаў прайшла да тэлефону ды занесла Антонаў нумар у чорны сьпіс.

Мой Сусьвет Няспраўджаных Жаданьняў, абражаны маімі енкамі ды скаргамі, шпурлянуў мне ў твар спраўджаную мрою. Як зьдзек. Тое, што гэта будзе мець такія наступствы, я не здагадвалася. Я залягла ў сваім пакоі, патэлефанавала Іры ды заскуголіла ў слухаўку: "Іра! Які

жах! Я не хачу! Нічога не хачу! Нікога не хачу! Мне лепей быць адной! Мне прасьцей быць адной! А, які жах! Ніхто мне не патрэбны!”

Я выйшла з аўтобусу пасьля вельмі канкрэтнай размовы, якая ў персьпектыве мела выразна акрэсьленыя наступствы. Заміж радасьці мяне ахапілі зусім іншыя адчуваньні.

Вас калі-небудзь білі пад дых? Калі мінае першы боль ад удару ў сонечнае спляценьне, чамусьці адчуваеш усярэдзіне жудасную пустэчу: нібыта ўтварылася дзірка ў грудзях. Антон аказаўся быццам вампірам, які адсмактаў маю энергію. Дык вось у чым розьніца між ім і Севам! Севачку ня трэба было тлумачыць, хто я такая: пяць гадоў знаёмства – гэта сур’ёзны тэрмін. Як мне расказаць Антону, напрыклад, пра тое, як я два гады таму пагаліла галаву? Такі факт можа напалохаць любога нармальнага хлопца. Нармальны хлопец – вось кім быў Антон. Уяўляю яго ў кампаніі маіх сяброў – непрыемная карцінка. Мы ўсе, хоць і дасталі крыху адно аднога, але прызвычаіліся да вар’яцтваў кожнага. А патлумачыць гэта ўсё чужому чалавеку... “Вось гэта Арцём, ён будыст. А вось гэта Дзёнік – зараз ён сьцісьне цябе ў абдымках ды пачне дэкламаваць свой улюбёны верш “З чаго пачынаецца Жодзіна?” А вось гэта мой брат Віця – знаеш, насамрэч з намі яго няма, а тое, што мы бачым – падман слыху, зроку ды тактыльная ілюзія. А знаеш, палова з прысутных тут – мае былыя бойфрэнды, пры тым іхнім жонкам гэты факт цудоўна вядомы! А вось яна я – уласнай персонай. Дзяўчынка, якая вырасла на сімфанічным джазе ды сучаснай японскай навэле, а зараз пачну трызьніць пра Парыж, прычым па-францускy. Табе яшчэ не расказалі, як я кінула два ўніверсітэты, была панкам у парваных джынсах ды з фіялетавым іракезам, а аднойчы, пасьля чорнай дэпрэсіі ды шалёнага запою, пагалілася налыса? Гэй, Антон, ты куды?”

Божа, хто ж ведаў, што так цяжка знаёміцца? Цяжка – у літаральным сэнсе: і маральна, і фізічна. Я ўвайшла ў кватэру зьбітая з панталыку, з дзіўнаватым тварам, ды ўсё думала, куды б схаваць вочы ад маці; нарэшце пастанавіла схаваць іх у акно: абаперлася локцямі аб падваконьне, абняла котку, з якой у нас была вечная вайна, ды ўтаропіла вочы ў неба. І адразу пачула за сьпінаю занепакоены голас маці:

– Жэня, што з табою? Ты ўжо гадзіну глядзіш у вакно!

Напэўна, нават мая сьпіна мела дзіўны выгляд. Такі стан – вельмі незразумелы й загадкавы – доўжыўся яшчэ два дні. Урэшце я абсалютна нематывавана расплакалася на працы – пасьля таго, як упусьціла на падлогу дзіркакол. Палезла пад стол падымаць ды расплакалася. Плачу ды дзіўлюся: што такое? І плачу... Сьлёзы самі ліюцца! У мяне пытаюцца: “Жэня, што з табой?” Я адказваю звычайным голасам: алергія! І плачу! Дзівосы… Я заплакала ўпершыню гады за два.

І напружаньне маё зьнікла. Я ўздыхнула з палёгкаю. Ух!... Нібыта жоран з шыі зьняла! Ну ўсё, до’ з мяне! Больш ні з кім ня буду знаёміцца. Досыць!

І вось – нарэшце! – упершыню за ўсё жыцьцё! – я адчула сябе цалкам шчасьлівай. Цяпер я ўжо пэўна ведала – і праверыла гэта на ўласным

досьведзе, што жыцьцё насамрэч большае за каханьне. Што ніякае пачуцьцё ня выб'е мяне з каляіны, не прымусіць мяне занурацца ў дэпрэсію ды ў самазьнішчальныя думкі. Я перастала баяцца сама сябе, баяцца адзіноты ды самоты. Адзінота – гэта звычайны чалавечы стан, і адзінота ня ёсьць трагедыяй. Адзінота ёсьць незалежнасьцю. Бо ніхто нам нічога не абяцаў. Не гарантавалі нам нябёсы, што мы знойдзем тут "шчасьлівае каханьне". Мы проста народжаныя шчасьлівымі – гэта так банальна, але да гэтага трэба дайсьці самому. Мабыць, дзіўнавата гэта прагучыць пасьля прагляду чорнага сьпісу майго тэлефону, але я нарэшце навучылася кахаць. Гэта зусім ня страшна. Гэта бясьпечна. Засталося толькі прычакаць на даляглядзе каго-небудзь вартага... Ну такога... Падобнага да прынца. І каб на белым кані...

Звычайнае жыцьцё. Паступова ў мой самадастатковы Сусьвет пачалі прыходзіць звычайныя пачуцьці.

Вось прыехала я здаваць сесію... Два тыдні ў Менску. Натуральна, я хацела пабачыць Севу. Натуральна, не пабачыла. Ну й дзякуй богу: уяўляю сабе нашую сустрэчу! Мы сядзелі б, надзьмутыя, у розных кутох, і нават не зірнулі б адно на аднога. Затое цяпер я ляжу, здаўшы ўсе выпыты, палю пад блакітным таршэрам ды чытаю "Тайную доктрину". Лухта яшчэ тая. Зараз вось вазьму свой тэлефончык ды набяру Севаў нумар, на дзьве хвіліны трапіўшы ў ягоную пустую кватэру...

Ды засну.

А можа, вазьму сшытак з алоўкам ды занатую ўсё гэта.

Усё ж атрымаўся расказ пра каханьне. Альбо пра любоў. Альбо пра нелюбоў – гледзячы з якога боку. Натуральна, да дасканалага чалавека мне яшчэ далёка-далёка… І я журбую. Раз-пораз. Звычайна начамі. І вельмі люблю пракручваць дзьвюххвіліннае кіно, дзе мы з Севам моўчкі сядзім у абдымках цемры ды слухаем перастук нашых сэрцаў...

І мне трэба як найхутчэй занатаваць гэта – пакуль з надыходам раніцы не абудзілася іншая Я – моцная ды ўпэўненая, бездакорная, самадастатковая Я, якая бязьлітасна перакрэсьліць, скамечыць ды спаліць у попелцы апошнія абзацы: які можа быць смутак? Якое такое кіно? І зробіць гэта Яна-Я ўпэўнена ды шчыра.

Мне трэба пратрымацца на гэтай сантыментальна-пранізьлівай ноце яшчэ трошкі! Адзначыць, што мне бывае сумна. Што мне хочацца прачынацца з кім-небудзь і хоць зрэдку каму-небудзь мыць шкарпэткі ды прасаваць кашулі – дзякаваць за каву ў ложак ды мільён пунсовых руж. Адзначыць тое, што пішу гэта, ня ведаючы, кім я стану: можа папраўдзе пракурорам. А мо', фатографам у Парыжы. Адцеміць, што пішу гэта ў дваццаць два гады: "Ня ведаю, кім я стану" – у такім веку! Суцэльны інфантылізм!..

Кім я стану? Я – ёсьць. Я чалавек. Ну вось, вось яна, раніца. Я прачнулася, шчасьлівая ды перапоўненая любоўю да ўсіх і ўсяго.

Добрай раніцы, планета Зямля!

ЛЮБЛЮ.